Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 1 (279) | Чацвер, 10 студзеня 1956 года | Цана 20 кап.

НАБЛІЖАЕЦЦА СЕСІЯ!

ЯК вы падрыхтаваліся

ДА ЯЕ?

Па універсітэту

Што паказалі вынікі сесіі на адным курсе

На IV курсе юрыдычнага факультэта закончылася зімняя экзаменацыйная сесія. Аналіз яе вынікаў уяўляе некаторую цікавасць.

Перш за усё кідаецца ў вочы рэзкае памяншэнне выдатных і добрых адзнак. У зімнюю экзаменацыйную сесію 1955/56 навуч. года толькі і4 студэнтаў з 83 атрымалі здавальняючыя адзнакі. У гэтым-жа годзе лік іх вырас да 26, а такія студэнты, як С. Андрэенка, А. Разанаў і А. Кербезаў паказалі нездавальняючыя веды.

Паменшыуся лік выдатнікаў на курсе. У летнюю сесію мінулага года 15 студэнтаў цяперашняга IV курса здалі усе экзамены толькі на «выдатна». А зараз-жа толькі чатыры студэнты (А. Садоускі, В. Вострыкаў, А. Мальчук і М. Розенберг) атрымалі выдатныя адзнакі па усіх прадметах. Некаторыя са студэнтаў-выдатнікаў атрымалі здавальняючыя адзнакі (Л. Балымава, К. Лыскоу).

А між тым студэнты знаходзіліся у больш спрыяльных умовах, чым студэнты IV курса мінулага навучальнага года. Сёлетняя чатверакурснікі не выязджалі у калгасы на сельскагаспадарчыя работы, па асобных прадметах быў зменшаны лік практычных і лекцыйных заняткаў. У іх было больш часу для самастойнай работы.

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што значная частка студэнтаў на працягу семестру не рыхтавалася да заняткаў, прапускала лекцыі і семінары, а да экзаменаў рыхтавалася толькі па канспектах, дарэчы, часта па чужых.

Некаторыя студэнгы думаюць, што скарачэнне лекцыйных гадзін па некаторых дысцыплінах робіцца для таго, каб студэнтам менш было работы. Яны вельмі памыляюцца. Наадварот, студэнты павінны яшчэ больш сур'ёзна працаваць на працягу усяго семестра

Частка віны за зніжэнне паспяховасці ускладаецца і на выкладчыкаў. іменна яны павінны праверыць на практычных занятках самастойную работу студэнтаў па вывучэнню рэкамендацыйнай літаратуры, нарматыуных актаў і г. д.

Ёсць студэнты, якія маюць патрэбу ў дапамозе сваіх таварышаў і выкладчыкаў. Так, напрыклад, студэнт Т. Андрэенка кожны год атрымлівае нездавальняючыя адзнакі. Не здаў 2 экзамены ён і ў гэтай сесіі. Напрашваецца пытанне, дзе-ж комсамольская арганізацыя курса, дзе дапамога таварышаў?! Вельмі дрэнна, што аднакурснікі С. Андрэенка думаюць толькі аб тым, каб самім не «заваліць» сесію.

Студэнтам, выкладчыкам трэба зрабіць адпаведныя вывады з вынікаў сесіі на IV курсе юрыдычнага факультэта.

В. Ф. ЧЫГІР.

ПЕРШЫЯ ЗАЛІКІ

Першыя залікі на нашым курсе паказалі, што студэнты добра папрацавалі на працягу усяго семестра. Асабліва трывалыя веды паказалі выпускнікі па такіх дысцыплінах, як «Арганізацыя і планаванне геолага-разведачных работ» і «Патрабаванні да мінеральнай сыравіны і тэхналогіі карысных выкапняў».

Каб лепш замацаваць тэарэтычны курс, мы за некалькі дзён да залікаў зрабілі экскурсію на фарфара-фаянсавы завод.

Цяпер на нашым курсе заканчваюцца практычныя заняткі.

Трэба адзначыць, што пяцікурснікі акуратна наведваюць усе лекцыі і практычныя заняткі. Ад гэтага у значнай ступені залежаць нашы першыя поспехі у гэтым семестры.

Г. ЕМЕЛЬЯНАЎ,
староста V курса аддзялення геалогіі.

5 ДЗЁН!

Звычайна сярод студэнтаў ходзіць думка, нібы на філалагічным факультэце не вучоба, а маліна: пачытывай кнігі ды матай на вус крытыку. А калі прыгледзішся—зусім не так. Па кожнаму прадмету тэкстаў трэба чытаць безліч. Цяжкавата будзе на прадстаячай сесіі многім студэнтам філфака. Гэта вельмі разумее першакурснік Нікалай Чыгрын. Але ён ужо засвоіу святое правіла: бачыць, што у чытальнай зале свабодных месцаў няма, ідзе у кабінеты. У крайнім-жа выпадку—і каля вакна прачытанае засвойваецца ніколькі не горш. (здымак 2).

(Працяг на 2 стар.)

Леанід Ярашэвіч і Нікалай Смеян—сардэчныя сябры. Разам іх можна бачыць усюды: і на лекцыях, і у чытальнай зале, і у кіно. На летнюю практыку яны таксама разам паехалі у соугас «Дзямідавічы» Дзержынскага раёна. Поуныя новых уражанняу, з багатымі матэрыяламі, сябры вярнуліся ва універсітэт. І зараз яны паспяхова працуюць над курсавымі работамі.

НА ЗДЫМКУ: студэнты IV курса біёлага-глебавага факультэта Леанід Ярашэвіч і Нікалай Смеян вызначаюць наяўнасць фосфара у глебе.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

ДА ЭКЗАМЕНАЎ—

Варта новаму году перайсці парог ВНУ, як новыя клопаты кладуцца на плечы студэнтаў. Усяго некалькі дзён назад мы віншавалі адзін другога са святам, весяліліся каля прыбранай ёлкі, узнімалі тосты за паспяховую здачу экзаменаў. І вось ужо сесія не за гарамі.

Святочны настрой у большасці студэнтаў зменіуся дзелавым, працоуным. У лабараторыях універсітэта зноу ідзе напружаная праца. Зойдзеш на фізмат—у радыёлабараторыі абавязкова убачыш старэйшакурснікаў. Адны нешта налідживаюць, другія збіраюць і разбіраюць хістальныя контуры. А хтосьці не супроць проста азнаёміцца з «унутраным» зместам радыёлямпаў або прыёмнікаў.

Зазірнем на хвілінку да будучых спецыялістаў-хімікаў. За вялікімі вокнамі—маркотны дзень. Холадна! А у лабараторыях утульна, цёпла. Сюды не далятаюць знешнія раздражняльнікі. Ды і не да іх цяпер—бо ужо на днях пачнуцца залікі. А здаваць іх давядзецца каля прыборау, там, дзе поугода праходзілі лабараторныя заняткі. Да таго-ж яшчэ многа неабходна ведаць студэнтам хімічнага факультэта, каб у школах паспяхова праводзіць заняткі з вучнямі. Вось чаму так уважліва другакурсніца Данута Шамрук. І ужо калі Дануце, скажам, на экзамене трапіць пытанне аб цэнтрафугіраванні, то будзьце упэунены—яна не падкачае... (здымак 1).

—РАСКАЖЫЦЕ АБ ВАШЫХ СПРАВАХ,—

з такім пытаннем наш карэспандэнт звярнуўся да некаторых студэнтаў універсітэта.

Вось што яны адказалі.

Ніна ЛУКЬЯНЦАВА—студэнтка III курса філалагічнага факультэта:

— Гэтая сесія будзе для студэнтаў III курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры нялёгкай: трэба здаць чатыры экзамены, залік па палітэканоміі. Таму да экзаменаў я рыхтуюся з самага пачатку навучальнага года. На працягу усяго семестра чытала праграмную літаратуру, сістэматычна рыхтавалася да семінарскіх і практычных заняткаў.

Праз некалькі дзён мы здаем залік па палітэканоміі. Трэба яшчэ раз паутарыць пройдзены матэрыял. Адначасова дачытваю некаторыя творы па зарубежнай літаратуры, канспектую патрэбную літаратуру.

Думаю, што сесію здам добра.

Майя КРЫВАШЭЕВА, студэнтка V курса фізіка-матэматычнага факультэта:

— Да дзяржаўных экзаменаў засталося усяго некалькі месяцаў. Зараз адначасова з падрыхтоукай да зімняй экзаменацыйнай сесіі я працую над дыпломнай работай на тэму «Спектральны аналіз свінцовістых латуняў». Свае доследы праводжу пад кіраўніцтвам Н. А. Барысевіча у фізічнай лабаратырыі падшыпнікавага завода. Даследаванні павінны дапамагчы у вырашэнні некаторых практычных пытанняў.

У падрыхтоуцы да зімняй экзаменацыйнай сесіі прытрымліваюся таго метаду, які апраудау сябе на працягу усёй вучобы ва універсітэце. Заключаецца ён у тым, што у час работы над канспектамі лекцый я запаўняю пакінутае месца матэрыялам з рэкамендаваных падручнікаў.

Людміла МАЙСЕЕНКА, студэнтка III курса біёлага-глебавага факультэта:

— Заліковая сесія на нашым курсе ужо пачалася. У канцы мінулага месяца здалі залік па фізічнай і калоіднай хіміі. На днях здаем залікі па палітэканоміі, эмбрыялогіі. Акрамя лекцыйнага курса вялікае месца займае у нас лабараторная практыка. Падрыхтоука да практычных заняткаў, семінараў на працягу усяго семестра, а зараз падрыхтоука да залікаў і складае поспех на экзаменах. Многае залежыць ад таго, як ты працаваў увесь семестр.

Насустрач выбарам у мясцовыя Советы

З студзеня адбыўся агульнауніверсітэцкі сход прафесарска-выкладчыцкага саставу і аспірантаў універсітэта, прысвечаны вылучэнню кандыдата ў склад гарадской выбарчай камісіі па выбарах у Мінскі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных.

Кандыдатам у гарадскую выбарчую камісію прысутныя аднадушна абралі старэйшага выкладчыка М. П. Баранаву.

МЭТА ЖЫЦЦЯ

Споунілася 50 год з дня нараджэння акадэміка Беларускай Акадэміі навук К. І. Лукашова.

К. І. Лукашоу з'яуляецца буйнейшым вучоным у галіне геалогіі і грунтазнаустза.

Як выключна здольны і арыгінальны даследчык К. І. Лукашоу вызначыуся яшчэ у студэнцкія гады, займаючыся у Ленінградскім дзяржаунym універсітэце (1927—1930 гг.) і у час знаходжання у аспірантуры (1931—1933 гг.). Будучы вучнем выдатнага вучонага, прафесара Ленінградскага універсітэта, членакарэспандэнта Акадэміі навук СССР П. А. Земятчанскага, К. І. Лукашоу яшчэ са студэнцкай скам'і абрау сваей спыцяльнасцю толькі што нараджаючаеся у той час грунтазнаустза. Ужо у самім выбары спецыяльнасці выявілася характэрная рыса К. І .Лукашова—яго глыбокая прынцыповасць, імкненне займацца іменна тымі пытаннямі, якія неабходна вырашыць у даны момант у сувязі з задачамі народнай гаспадаркі нашай краіны.

Сумесна з прафесарам Земятчанскім К. І. Лукашоу арганізаваў у ЛДУ першую у СССР кафедру грунтазнаустза, чым быу пакладзен пачатак падрыхтоукі айчынных спецыялістау-грунтазнаучау.

У сувязі з паяуленнем спецыяльнасці грунтазнаустза спатрэбілася абгрунтаванне мэт і задач грунтазнаучау. К. І. Лукашоу складае кнігу «Грунтазнаустза» (1933 год). Па водгуках спецыялістау гэтая кніга з'явілася першай па грунтазнауству на рускай і замежнай мовах, якая аформіла дысцыпліну грунтазнаустза. У ей упершыню сфармуляваны прадмет і задачы грунтазнаустза, як самастойнай інжынерна-геалагічнай навукі. За кнігу «Грунтазнаустза» К. І. Лукашову прысуджана навуковая ступень кандыдата геолага-мінералагічных навук.

У вывучэнні грунтазнаустза К. І. Лукашовым атрыманы цікавыя вынікі, якія абагульнены у радзе навуковых работ. Працы К. І. Лукашова з'яуляюцца каштоуным дапаможнікам для практыкау-грунтазнаучау, інжынерау, студэнтау вышэйшых навучальных устаноу.

К. І. Лукашоу актыуна удзельнічау таксама у вывучэнні вечнай мерзлаты грунтау. Значэнне гэтай работы бясспрэчна, калі улічыць,

што у нашай краіне маецца вобласць вечнай мерзлаты, дзе вядзецца рознастайнае будаўніцтва.

За час 25-гадовай навуковай і педагагічнай дзейнасці вучоны займаўся многімі галінамі ведау: даследаваннем працэсау выветрывання і стварэння кары выветрывання, вывучэннем мінеральных рэсурсау зарубежных краін і эканомікі ЗША, развіццём прадмета фізічнай геаграфіі частак свету, вывучэннем рэдкіх металау і г. д. Сабраны матэрыял па працэсах выветрывання і стварэння кары выветрывання паслужыу для напісання доктарскай дысертацыі на тэму: «Фізіка-геаграфічныя умовы і працэсы выветрывання у пауночнай і сярэдняй частцы Амурскага басейна», якую К. І. Лукашоу абараніу пры ЛДУ у 1937 годзе. Усяго ім напісана звыш 75 навуковых работ па розных актуальных праблемах грунтазнаустза, карысных выкапнях, геаграфіі і інш.

У Акадэміі навук БССР і у нашым універсітэце ім праводзіцца значная работа па геахімічнаму вывучэнню горных парод Беларусі. У прыватнасці, распрацоуваецца тэма, якая адносіцца да вывучэння лёсавых і іншых адкладанняу на тэрыторыі рэспублікі.

Работы вучонага заусёды карыстаюцца высокай ацэнкай з боку совецкай навуковай грамадскасці.

У прыватнасці, работа, якая з'явілася тэмай доктарскай дысертацыі, у 1938 годзе была прадстаулена у камітэт па правядзенню Усесаюзнага конкурса навуковых работнікау. Работа была высока ацэнена конкурснай камісіяй і атрымала прэмію. У выніку конкурса у артыкуле «Аб выніках конкурса маладых навуковых работнікау», які быу змешчаны у часопісе «Прырода» у 1938 годзе, пісалася: «За апошнія гады выраслі такія вучоныя, выхадцы з асяроддзя рабочых і служачых, як акадэмік Т. Д. Лысенка, доктар-аграном В. Н. Цыцын, доктар-біёлаг Асцрацян, Камышанка, Лукашоу і дзесяткі другіх. Характэрна пры гэтым, што гэтыя людзі не толькі цалкам авалодалі навукай, яны тварцы новай навукі, барацьбіты супроць рэакцыйных плыняу у навуцы».

Прачытаушы кнігу К. І. Лукашова «Асноўныя генетычныя тыпы цацвярцічных адкладанняу у СССР» (вышла у 1956 годзе), акадэмік В. А. Обручау пісау: «Чацвярцічныя адкладанні Совецкага Саюза, нарэшце, дачакалися востра неабходнага зводнага апісання іх генетычных тыпаў на падставе сучасных дэталёвых даследаванняу са шматлікімі аналізамі».

У 1956 годзе, улічваючы вялікія заслугі К. І. Лукашова перад совецкай навукай, яго абралі віцэпрэзідэнтам Акадэміі навук БССР. У сувязі з гэтым і з 50-годдзем з дня нараджэння прафесарска-выкладчыцкі састау універсітэта горача вітае К. І. Лукашова і жадае яму новых поспехаў у навуковай дзейнасці.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ

КОМУНІСТЫ АБМЯРКОЎВАЮЦЬ РАБОТУ КАФЕДР

На адкрытым партыйным сходзе біёлага-глебавага факультэта абмяркоувалася работа кафедр фізіялогіі раслін і глебазнаустза. Былі заслуханы справаздачы загадчыкау кафедрамі прафесараў Т. Н. Годнева і І. С. Лупіновіча. У спрэчках выступілі не толькі комуністы, але і беспартыйныя выкладчыкі. Былі адзначаны станоучыя бакі у рабоце кафедр, але асаблівая увага схода была звернута на недахопы. Гаварылася у прыватнасці, што кафедры фізіялогіі раслін і глебазнаустза марудна перабудоуваюць сваю работу у адпаведнасці з інструктыуным пісьмом Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР. Мерапрэмствы, праводзімыя кафедрамі, не заусёды неабходным чынам і своечасова дакументыруюцца; на кафедры глебазнаустза адсутнічае план работы на 1956-57 навучальны год; пасяджэнні кафедр праводзяцца не рэгулярна, не заусёды знаходзяць адлюстраванне у рабоце кафедр навуковыя, вучэбныя і выхаваўчыя пытанні.

Маюць месца скаргі студэнтау на нездавальняючы узровень чытання курса па мікрабіялогіі (дацэнт А. Л. Езубчык), правядзення практыкума па біяхіміі (асістэнт Н. С. Судзік), некаторых практыкумау па глебазнауству (асістэнт А. М. Папова). Абедзве кафедры недастаткова займаюцца метадычнай работай на завочным факультэце. Рэзультаты навукова-даследчай работы не заусёды унядраюцца у вытворчасць. Так здарылася, напрыклад, з даследаваннем па картыраванню глебаў у некаторых калгасах Дзержынскага раёна. Слаба працуюць на кафедрах навукова-даследчыя студэнцкія гурткі. На кафедры глебазнаустза навуковы гурток наогул спыніў сваю работу.

Недахопам работы кафедр з'яуляецца таксама і тое, што не вызначаны гадзіны работы асобных навуковых супрацоунікау, што перашкаджае больш цеснаму кантакту з імі студэнтау.

Усе адзначаныя недахопы маюць у большасці выпадкау месца і на іншых кафедрах, таму абмеркаванне работы двух кафедр прыняло больш шырокі характар.

На сходзе была прынята прапанова аб аднауленні на факультэце глебавага аддзялення, на якім рыхтавалися б нацыянальныя кадры глебазнаучау. У сувязі з гэтым было выказана меркаванне аб перабудове работы кафедры так, каб яе выпускнікі маглі б выкладаць батаніку і заалогію у сярэдняй школе.

На сходзе прысутнічала многа беспартыйных супрацоунікау факультэта, у тым ліку усе загадчыкі кафедрамі.

Рашэнне, прынятае сходам, накіравана на ліквідацыю недахопаў у рабоце кафедр.

А. Г. КАРТАШОВА,
кандыдат біялагічных навук.

...Актывізаваць работу гуртка

З пачатку навучальнага года на факультэце працуе навуковы геалагічны студэнцкі гурток. У параунанні з мінулым годам работа у ім значна палепшылася. На пасяджэнні гуртка прачытан рад цікавых дакладаў.

Работа у гуртку стала асабліва актуальнай зараз, калі вялікая увага надаецца самастойнай рабоце студэнтау. Удзельнікі гуртка маюць магчымасць пашырыць свае веды па многіх пытаннях геалогіі, методыкі пошукау і разведкі, бурэнню і г. д., а таксама пазнаёміцца з літаратурай, навучыцца лагічна выказваць свае думкі перад аудыторыяй, што вельмі неабходна у будучай рабоце.

З асаблівай цікавасцю былі праслуханы на пасяджэнні даклады К. Казей—«Аб методыцы разведкі карбонавых вугаляу», Блажэвіч—«Бурыя вугалі Закарпацця», Ур'ева і Майскага—«Новыя прыстасаванні у тэхніцы бурэння».

Аднак у рабоце гуртка назіраюцца некаторыя недахопы. Значная частка гурткоуцау сістэматычна прапускаюць заняткі. Мала цікавіцца работай гуртка прафесарска-выкладчыцкі састау. Тэматыка дакладаў застаецца такуль што аднастайная, мала рыхтуецца дакладау па геалогіі. Наша задача—зжыць недахопы.

В. БАГІНО.

Атамная выстаука у МІНСКУ

Прайшло усяго каля двух дзесяцігоддзяу з таго моманту, калі перад навукай адкрылася рэальная магчымасць паставіць на службу чалавека невычарпальныя запасы энергіі, заключанай у нетрах атамау. Але ужо сёння тыя працэсы, якія учора былі толькі аб'ектам лабараторных даследаванняу вузкага кола вучоных, трывала уваходзяць у тэхніку, энергетыку, біялогію, медыцыну, палягчаючы працу чалавека, прыносячы яму вылячэнне ад цяжкіх захворванняу.

Можна смела сказаць, што у пытаннях выкарыстання атамнай энергіі у мірных мэтах наша краіна займае вядучае месца у свеце.

Аб гэтым яскрава сведчыць перасоачная выстаука па мірнаму выкарыстанню атамнай энергіі, адкрытая у тэатры оперы і балету у Мінску.

Гэтая выстаука амаль цалкам дубліруе атамны павільён, які пастаянна дзейнічае у Маскве на прамысловай выстауцы, і, перш тым трапіць у наш горад, праехала доугае падарожжа. Яна пабывала у Швецыі, а затым у Ленінградзе і Кіеве. У Мінску выстаука будзе экспанавацца да 13 студзеня, пасля чаго яна будзе перавезена у Фінляндыю.

У васьмі раздзелах выстаукі шырока прадстаулены экспанаты, якія сведчаць аб надзвычайна шырокім выкарыстанні атамнай энергіі у энергетыцы, геалогіі, біялогіі, медыцыне, сельскай гаспадарцы і тэхніцы.

У раздзеле энергетыкі сярод іншых экспанатау дэманструецца макет нашай дзейнічаючай электрастанцыі на 5 тысяч кілават, схемы і макеты дзеючых і будуючыхся ядзерных рэактараў. Такія рэактары з'яуляюцца сэрцам любой атамнай сілавой устаноукі, а таксама асноунай крыніцай магутных струменняу нейтронаў, неабходных для стварэння штучных радыёактыуных ізатопаў.

Шырока асвятляецца прымяненне мечаных атамаў у біялогіі, хіміі, сельскай гаспадарцы.

Цэлы раздзел выстаукі прысвечаны пытанню па засцяроге чалавека ад шкодных для яго арганізма радыёактыуных выпраменьванняу.

У самым вялікім раздзеле выстаукі—раздзеле тэхнікі—можна убачыць устаноукі для прасвечвання стальных дэталяу з дапамогай гама-праменняу (гама-дэфектаскопы), прыборы для вызначэння узроуню вадкасці у закрытых сасудах, дзеючую устаноуку для радыёактыунай маркіроукі сталі і многія іншыя экспанаты, якія сведчаць аб тым, наколькі шырока ужываюцца у нас у сучасны момант штучныя радыёактыуныя ізатопы у самых рознастайных галінах тэхнікі.

Выстаука у цэлым добра аформлена і дазваляе наглядна пераканацца у тым, якіх вялікіх поспехаў дасягнула наша краіна у справе выкарыстання адной з важнейшых заваёу чалавечага гення—атамнай энергіі. Няма сумнення у тым, што студэнты і навуковыя работнікі нашага універсітэта з вялікім задавальненнем азнаёмяцца з выстаукай.

Л. ТАМІЛЬЧЫК,
аспірант.

Пісьмы у рэдакцыю

ГЭТА ТАКСАМА ВАЖНА

Зусім незнаёмы чалавек даведаушыся, што перад ім студэнт-хімік, прыходзіць у захапленне: «Вось добра!» І нярэдка звернецца з запытаннем, як лепш змыць пляму з адзення, як карыстацца хімічнымі рэактывамі. І як расчароуваецца кожны, калі высветліцца, што гэты хімік нічога адказаць не можа. Але не таму, што не ведае хіміі. Не. Ён добра ведае вельмі складаныя формулы, працяканне рэакцый, можа спрачацца аб рознастайных хімічных працэсах, а вось самага простага не ведае. І калі яму называюць састау плямавывадзіцеля або якога-небудзь іншага прэпарата, ён можа доуга і вельмі грунтоуна тлумачыць іх якасці.

У нас ужо даўно ідуць размовы аб стварэнні гуртка «Хімія у быту». Такі гурток патрэбен. Ён быу-бы вельмі цікавым і дапамог-бы студэнтам паглыбіць свае веды у хіміі і, галоунае, такі гурток неабходны для больш шырокага разумення бытавой хіміі. Калі-ж, нарэшце ад размоу перайдуць да справы?

З. ШЧАРБАКОВА,
студэнтка III курса хімічнага факультэта.

5 ДЗЁН!

ДА ЭКЗАМЕНАЎ—

(Пачатак на 1 стар.)

Закончыўся ва універсітэце працоуны дзень, але у інтэрнатах ён працягваецца доуга-доуга. Хто рыхтуецца да семінару, хто штудыруе канспекты прадстаячага заліку, хто «пацее» над апошнімі незданымі «тысячамі» або дапісвае заключную частку курсавой работы.

Вось ужо змоуклі рэпрадуктары па вулицы Свердлава, але яшчэ ярка свецяцца вокны многіх пакояу. Уваходзім у адзін з іх. Тут жывуць будучыя геолагі. Глыбокая ноч, а студэнтам не спіцца.

— Прачытаю яшчэ старонак 20—30,—гаворыць Міхаіл Васілеускі,—і тады можна на спакой (здымак 3).

Хутка сесія. Яна дае аб сабе адчуваць. Яна ва усім прыкметна. Але вось бяда: сесія, відаць, не хвалюе гаспадарнікау. У нас у інтэрнатах пражываюць больш палавіны ўсіх студэнтау, а пральні няма ніводнай. Бруднай стала кашуля, або каунерык запэцкауся і... даводзіцца губляць каштоуны час на такія справы, якія вы бачыце на чацвертым здымку.

М. ПІЛЬШЧЫКАЎ.

Па слядах нашых выступленняў

„Хаваючыся за спіны таварышаў“

Заметка, змешчаная ў № 35 «Беларускага універстіэта» пад такім загалоўкам, была накіравана на рэагаванне у дэканат хімічнага факультэта. Дэкан факультэта І. Г. Цішчанка паведаміў рэдакцыі, што факты, прыведзеныя ў заметцы, адпавядаюць сапраўднасці.

У мэтах ліквідацыі адзначаных недахопаў і мабілізацыі студэнтаў на сур'ёзную падрыхтоўку да заняткаў студэнты, аб якіх ішла размова у заметцы, папярэджаны з боку дэканата. Выпадкі нядобрасумленнай падрыхтоўкі студэнтаў да семінарскіх заняткаў, а таксама парушэнні дысцыпліны былі абмеркаваны на пасяджэнні комсамольскага і профсаюзнага бюро факультэта, на групавых студэнцкіх сходах.

Загадчыкам кафедрамі зроблена указанне аб павышэнні індывідуальнай патрабавальнасці да студэнтаў пры выкананні лабараторных работ, а таксама аб узмацненні кантролю пры выкананні лабараторных задач і аб ускладненні некаторых задач лабараторных практыкумаў.

На бліжэйшай вытворчай нарадзе намечана абмеркаваць пытанне аб ходзе лабараторнага навучання студэнтаў. Намечаны меры па арганізацыі іх самастойнай работы.

„Работу СНТ—у цэнтр увагі“

Абмеркаваўшы артыкул «Работу СНТ—у цэнтр увагі», змешчаны ў газеце «Беларускі універсітэт» (№ 35 за 1956 год), аб рабоце студэнцкіх навукова-даследчых гурткоў, кафедра зарубежнай літаратуры, згаджаючыся з крытычнымі заўвагамі газеты, прызнае, што ў гэтым семестры гурток пры кафедры сапрауды некалькі паслабіў сваю работу. У сучасны момант работа гуртка актывізуецца. Праведзен літаратурны вечар, прысвечаны кнізе выдатнага французскага спевака Іва Монтана «Солнцем полна голова», на якім былі заслуханы тры даклады, два з якіх, на думку кафедры, маюць значную навуковую цікавасць. Студэнты распрацоўваюць цікавыя тэмы. Рад дакладчыкаў кансультуюцца у членаў кафедры, і некаторыя з дакладаў у бліжэйшы час будуць пастаулены на абмеркаванне гуртка.

Д. Е. ФАКТАРОВІЧ,
загадчык кафедры зарубежнай літаратуры.

РАЗМОВА АБ ДЫСЦЫПЛІНЕ

Нядаўна на IV курсе аддзялення геалогіі праходзіў комсамольскі сход. У гэты раз на абмеркаванне было вынесена пытанне аб дысцыпліне, якая значна пагоршылася за апошні час.

У пачатку бягучага года здавалася, што курс пачынае заваёўваць добрую славу. Але за апошні час сталі зноў частымі выпадкі парушэння дысцыпліны. Рэзкай крытыцы на сходзе былі падвергнуты за пропускі лекцый Дамброускі, Васілеускі, Рысявец. Сход вынес ім суровую вымову. Комсамольцы сур'ёзна папярэдзілі студэнтаў Макарэвіча, Ляховіча, Якаулеву, якія слаба рыхтуюцца да семінарскіх заняткаў.

Не пакінулі комсамольцы ў спакоі і свайго аднакурсніка Лісіцу, які напіўся п'яным і учыніў у інтэрнаце дэбош.

Аднак актыўнасць у абмеркаванні гэтых пытанняў жадала-б быць лепшай. Аб гэтым сведчыць той факт, што на сходзе адсутнічала без уважлівых прычын 15 комсамольцаў.

Трэба спадзявацца, што барацьба з недахопамі на курсе будзе актывізавацца.

В. СІДАРАЎ.

ГАЛЯ ГАБРЫНЕЦ: *„Я вельмі люблю сваю прафесію“*

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

Быць настаўніцай Галя рашыла яшчэ у школьныя гады. І як не вабілі яе у дзяцінстве, а потым і у юначыя гады прафесіі урача, інжынера, Галя жадала стаць педагогам. З кожным годам мара яе усё больш і больш рабілася цвёрдай. Толькі доугі час яна не магла вырашыць, куды пойдзе вучыцца, калі скончыць сярэднюю школу: яна вельмі любіла літаратуру, захаплялася фізікай, хіміяй, добра ведала матэматыку. Але вось, калі Галя была ужо у дзевятым класе, у Яноўскую школу на Віцебшчыне, дзе яна вучылася, прыехала выпускніца нашага універсітэта, выкладчык гісторыі Зінаіда Іванаўна Высакоуская. Маладая настаўніца здолела прывіць любоў сваім вучням да гісторыі. На уроках яна расказвала не толькі тое, што было у падручніках,—звярталася да творау мастацкай літаратуры. І Галя цвёрда рашыла пасля заканчэння дзесяцігодкі паступіць на гістарычны факультэт Беларускага універсітэта. Яна ведала, наколькі добра падрыхтаванай патрэбна быць, каб паступіць ва універсітэт.

— Я не магла аддаваць увесь свой час вучобе,—прызнаецца Галя.—Бацька загінуу на фронце у час вайны, і мне давялося многа працаваць, дапамагаючы маці. У школе я была сакратаром комсамольскай арганізацыі. На усё гэта траціла многа часу.

Але нягледзячы на цяжкасці, дзесяты клас Галя закончыла з залатым медалем...

Мінск. Першыя дні заняткаў. Спачатку было няёмка сярод незнаемых людзей, але заусёды вясёлая, Галя хутка знайшла сяброў. Гэтую дзяучыну палюбілі за вясёлы жарт, смех, за шчырае жаданне дапамагаць другім.

Вось і першая сесія. Галя дарэмна хвалявалася: усё экзамены яна здала на «выдатна». Ды інакш і не магло быць, таму што да сесіі Галя пачала рыхтавацца задоуга да яе пачатку. На «выдатна» здала яна і летнюю сесію. Гэта былі вынікі стараннай і напружанай працы на працягу усяго семестра, на працягу ўсяго навучальнага года.

На другім курсе работы прыбавілася: у гэтым годзе на профсаюзным сходзе Галю выбралі у профбюро факультэта. Але гэта ёй ніколькі не перашкаджае сістэматычна рыхтавацца да практычных заняткаў, да семінараў. Амаль кожны дзень яе можна убачыць у чытальнай зале або кабінеце. У ауторак патрэбна падрыхтавацца да практычных заняткаў па гісторыі сярэдніх вякоў, у пятніцу—па гісторыі СССР, у панядзелак—да семінара па гісторыі КПСС і г. д. Рыхтуючыся да практычных заняткаў, акрамя рэкамендацыйнай літаратуры, Галя прачытвае многа іншай.

Жаданне ведаць як мага больш, прымушае яе многа чытаць мастацкіх творау, глядзець кіно, бываць у тэатрах на пастаноўках, прысвечаных тэме гістарычнага мінулага. Гэта, бясспрэчна, дапамагае больш глыбокаму асэнсаванню жыцця, гісторыі.

Набліжаецца зімовая экзаменацыйная сесія. Зараз Галя старанна да яе рыхтуецца. Сяброукі Галі —Леаніда Федаровіч і Рая Мірончык, якія прысутнічалі ў час нашай размовы, сказалі, што яны упэунены ў тым, што і гэтую сесію Галя здасць на «выдатна». Гэта сказалі дзяўчаты, якія добра ведаюць сваю сяброўку.

І. ШУЦІК.

ІХ ГАЗЕТА ЦІКАВАЯ

Ва універсітэце выпускаецца каля 30 насценных газет—факультэцкіх, спартыўных, інтэрнацкіх, «Бюлетэні СНТ» і г. д.

Цікавай па свайму зместу і афармленню выходзіць насценная газета на фізіка-матэматычным факультэце «За навуку». На аглядах конкурсах, якія звычайна адбываюцца перад Днём друку, яна ужо некалькі год падрад адзначаецца з лепшага боку.

У тым, што газета «За навуку» заваявала аўтарытэт на фізмаце, нямалая заслуга студэнтаў Марыка Неменмана і Анатоля Межэня. Яны падтрымліваюць цесную сувязь з партыйнай, комсамольскай і профсаюзнай арганізацыямі. І матэрыялы у выпускаемых нумарах—самыя рознастайныя, адлюстроўваючыя з усей паўнатой жыццё аддзяленняў, курсаў, груп.

«Пылясос»—вядомы усяму універсітэту сатырычны дадатак газеты «За навуку». Горача становіцца таму, хто трапляе на яго старонкі. Зараз яго афармляюць некалькі чалавек і у тым ліку студэнт І курса аддзялення матэматыкі Яфім Клімковіч.

М. ПІЛЬШЧЫКАЎ.

На здымку: М. Неменман і А. Межэнь рыхтуюць чарговы нумар насценгазеты.

ПЕДАГОГ

(Нарыс)

Гэта было у 1944 годзе. У адзін з прыгожых ліпеньскіх дзён у мястэчку Пагост-Загародск паявіуся незнаёмы вайсковы—невысокага росту, з трафейным аутаматам на плячы. Гэта быу малады настаунік Захар Ошэравіч Зімак, які часова змяніу у гады вайны геаметрычную лінейку на аутамат.

Былы двухпавярховы будынак школы сустрэу настауніка чорнымі квадратамі выламаных дзвярэй і вокан. Парт не было, падлогі таксама (гітлераўцы зрабілі у школе канюшню). Нішто не нагадвала ужо аб тым, што калісьці тут вучыліся дзеці. Толькі у адным з класау Захар убачыу выпадкова уцалеушы шматок геаграфічнай карты. Вось і усё...

Для маладога настауніка пачаліся цяжкія, напружаныя дні. Не было досак, цвікоу, падручнікау, сшыткау і нават самых звычайных алоукау. Днём Захар выкладау арыфметыку і геаметрыю, а ноччу з аутаматам у руках удзельнічау у знішчэнні астаткау паліцэйскіх банд. У Заходняй Беларусі тады яшчэ было неспакойна. У мястэчку арганізавалася самаабарона, якую узначаліу комуніст Зімак.

...Зімняя ноч. Жоутай дыняй усміхаецца з неба маладзік. Вакол цішыня, і толькі зрэдку трашчыць на возеры лёд. У акне настаунікі мільгае свет капцілкі.

І раптам аднекуль узнікае чалавечая постаць. Блытаючыся у сумётах, нехта бяжыць да адзінокага агенчыка у Захаравым акне і крычыць:

— Ратуйце! Рабуюць!

«Зноу банда!»—з трывогай падумау Захар і кінууся да дзвярэй.

НА КОНКУРС

— Дзе яны?—паспешліва спытау Захар у падбегшага чалавека. Той сударгава учапіуся у рукаў настаунікі і пацягнуу яго на вуліцу. Ён паказваў рукой у бок дзіцячага дома.

«Няужо бандыты?»—свідравала Захара думка. Але калі ён апынууся каля дзіцячага дома, усё стала зразумелым. Дырэктар паведаміу Захару, што выхаванцы дзетдома сцягнулі цэлы пуд сала і зараз п'янствуюць у адным з пакояу. Дырэктар раіу Захару не ісці туды:

— У іх нажы,—гаварыу ён.—Яшчэ зарэжуць...

Але Захар рашуча піхнуу дзверы. Нечаканага госця рэбяты сустрэлі варожымі позіркамі.

«Чаго ты прыплёуся сюды?—нібы гаварыli іх п'яныя вочы.—Жыць надакучыла, ці што?—Дастаткова было іх важаку толькі падаць знак і яны-б накінулися на Захара.

Захар падыйшоу да стала, адпіхнуу недаедзены кавалак сала і нягромка, але цвёрда крыкнуу:

— Устаць! Нажы на стол!

Жорстка бліснулі дзікія агенчыкі у вачах «атамана» Антона, бліснулі і патухлі, не вытрымаушы цвёрдага позірку настаунікі. Злосна усміхнуушыся, ён першым кінуу фінку на стол...

Пазней у дзіцячым доме з'явіуся Уладзімір Карабанау. Чорнавокі, вясёлы—хутчэй гэта быу жулік-артыст, які бачыу у крадзяжы нешта небяспечнае, але занадта прыемнае. Ён не украдзе у разявы-дзядзькі тайком на кірмашы, а абавязкова «дапаможа» яму гандляваць і «дапаможа так, што апошні ніколі не западозрыць свайго «памочніка» у прапажы цэлага дзесятка гарбузоу.

(Працяг на 4 стар.)

Экскурсія на „БЕЛАРУСЬФІЛЬМ“

— Увага! Падрыхтаваліся!

— Здымак 252, дубль 2. Маторы!

Здымаецца адна з апошніх сцэнак, або «планау», як гавораць кіноработнікі, будучага фільма «Лес шуміць».

Студэнтам III курса аддзялення журналістыкі пашанцавала прысутнічаць у здымачным павільёне якраз у час работы над гэтым планам.

...Маленькі столік, каля яго крэсла і раскошны дыван. На сценах партрэты, карціны мастакоў захаду. На дыване сядзіць кіноактрыса Ігарыёнава. Яна выконвае ў фільме роль Аксаны. Магутныя асвятляльныя апараты і вочы каля 40 чалавек кіноработнікаў і экскурсантаў звернуты да яе.

— Аксана, я табе спадабаюся?—чуецца голас з боку.

— Як-жа можа быць, пане, каб пан не спадабаўся?

Святло паступова змяншаецца.

Гэта сцэнка паўтараецца многа разоў. Дастаткова малейшага шэпту, няхай нават за сцяной, як гукааператар здымае навушнікі і строга заяўляе:

— Размовы! Зноу усё на глум пайшло!—і імкнучыся захаваць роўнавагу, спакойна дадае:—Пачынайце спачатку.

Кожны аматар кіно бачыць фільм толькі на экране і наўрад ці мае дакладнае ўяўленне, якую упартую працу павінны прарабіць артысты, рэжысёры, аператары, пакуль створаць фільм.

Кожны вынес адтуль добрыя ўражанні, а Шыману Раманчуку пашанцавала яшчэ атрымаць фото Ігарыёнавай з яе ўласным аўтографам.

В. КАНАВАЛЮК.

АБ НОВЫМ ПАРАДКУ НАЗНАЧЭННЯ СТЫПЕНДЫЙ

У рэдакцыю паступіу рад пісьмаў, у якіх чытачы звяртаюцца з некаторымі пытаннямі аб парадку назначэння стыпендый студэнтам вышэйшых навучальных установ.

Ніжэй мы друкуем адказы на гэтыя пытанні, змешчаныя у часопісу «Вестник высшей школы».

У ЯКІМ ПАРАДКУ РАЗГЛЯДАЮЦЦА ЗАЯВЫ СТУДЭНТАЎ АБ НАЗНАЧЭННІ ІМ СТЫПЕНДЫІ?

Усе студэнты для атрымання стыпендыі падаюць заяву на імя рэктара ВНУ.

Для назначэння студэнтам стыпендыі на факультэтах ствараюцца камісіі на чале з дэканам з удзелам грамадскіх арганізацый. Стыпендыяльныя камісіі ствараюцца тэрмінам на адзін год і зацвярджаюцца рэктарам па узгадненню з грамадскімі арганізацыямі.

Стыпендыяльныя камісіі пры разглядзе заяу студэнтаў аб назначэнні ім стыпендыі павінны улічваць паспяховасць і матэрыяльнае становішча студэнтаў (наяунасць членаў сям'і і іх агульны заработак—даход). Студэнтам, якія атрымоуваюць пенсію у сувязі са стратай кармільца з ліку рабочых і служачых, стыпендыі назначаюцца на агульных падставах.

ЯКІ ПАРАДАК НАЗНАЧЭННЯ СТЫПЕНДЫЙ ПРЫ ПЕРАВОДЗЕ СТУДЭНТАЎ З КУРСА НА КУРС І З АДНОЙ ВНУ Ў ДРУГУЮ?

Студэнты, пераведзеныя на наступны курс, атрымоуваюць стыпендыю да пачатку заняткаў на наступным курсе у размеры, устаноуленым для мінулага навучальнага курса, а у далейшым—у размеры, устаноуленым для наступнага курса.

Студэнты, пераведзеныя з адной ВНУ у другую або з адной спецыяльнасці на другую у той-жа ВНУ па загаду адпаведнага галоунага управлення навучальнымі установамі міністэрства (ведамства), а таксама па хваробе (пры наяунасці заключэння медыцынскай установы) залічваюцца на стыпендыю па выніках адзнак апошняй экзаменацыйнай сесіі (атрыманых у ВНУ) ці на факультэце, з якога яны пераводзяцца, незалежна ад наяунасці акадэмічнай запазычанасці, якая стварылася у выніку неадпаведнасці у вучэбных планах.

ЯК НАЗНАЧАЮЦЦА СТЫПЕНДЫІ СТУДЭНТАМ У ДРУГІМ І НАСТУПНЫХ СЕМЕСТРАХ?

У другім і наступных семестрах стыпендыі назначаюцца з першага чысла наступнага за экзаменацыйнай сесіяй месяца: права атрымання стыпендыі маюць студэнты, выканаушыя вучэбны план семестра (здаушыя усе залікі, у тым ліку з дыферэнцыяльнымі адзнакамі—не ніжэй «здавальняюча») і атрымаушыя па выніках экзаменацыйнай сесіі адзнакі «выдатна» і «добра», а у асобных выпадках—і адзнакі «здавальняюча».

Студэнты, страціушыя права на стыпендыю па выніках экзаменацыйнай сесіі, не атрымоуваюць стыпендыю, пачынаючы з першага чысла наступнага за заканчэннем экзаменацыйнай сесіі месяца.

КАМУ СА СТУДЭНТАЎ СТЫПЕНДЫІ НАЗНАЧАЮЦЦА НЕЗАЛЕЖНА АД МАТЭРЫЯЛЬНАГА СТАНОВІШЧА?

Стыпендыі незалежна ад матэрыяльнага становішча пры наяунасці адзнак не ніжэй «здавальняюча» атрымоуваюць студэнты: Герої Совецкага Саюза і Герої Сацыялістычнай Працы; былыя выхаванцы дзіцячых дамоу і дзіцячых працоуных выхаваучых калоній і дзеці, якія знаходзяцца на патранаце: глуханямыя і сляпыя; асобы, якія маюць права на атрыманне стыпендыі па асобных распаряджэннях Урада СССР.

Незалежна ад матэрыяльнага становішча назначаюцца таксама імянныя стыпендыі, але з захаваннем правіл, установленых існуючымі палажэннямі аб іх.

У выпадку, калі размер імяннай стыпендыі ніжэй стыпендыі, атрымоуваемай выдатнікамі адпаведнага курса, выплата імяннай стыпендыі вытвараецца на 10 працэнтаў вышэй стыпендыі студэнтаў-выдатнікаў адпаведнага курса.

ЦІ НАЗНАЧАЕЦЦА СТЫПЕНДЫЯ СТУДЭНТАМ, ПАКІНУТЫМ НА ДРУГІ ГОД?

Студэнтам, пакінутым на паўторны год навучання з-за непаспяховасці, стыпендыя не выплачваецца на пяцігу усяго паўторнага года навучання.

Студэнтам (стыпендыятам), пакінутым на тым-жа курсе у сувязі з водпускам, звязаным з хваробай, своечасова аформленым загадам рэктара ВНУ на падставе адпаведных дакументаў лячэбных установ, выплата стыпендыі аднауляецца з моманту пачатку заняткаў у паўторным навучальным годзе да выпіску першай экзаменацыйнай сесіі, пасля чаго стыпендыя назначаецца на агульных падставах.

КАМУ НАЗНАЧАЮЦЦА ПАВЫШАНЫЯ СТЫПЕНДЫІ?

Студэнтам, атрымаушым па выніках экзаменацыйнай сесіі «выдатна» па усіх прадметах, у тым ліку і на залікаў з дыферэнцыраванымі адзнакамі, памер стыпендыі павышаецца на 25 працэнтаў з пачатку наступнага за экзаменацыйнай сесіяй месяца.

Михаил СТРЕЛЬЦОВ

ДЕВОЧКА

Вместе с куклой книжки и тетрадки
Мирно отдыхают в тишине
Девочка спокойно спит в кроватке
Нежно улыбается во сне.

Может быть, ей праздничные флаги
Ночь вплетает в раздужные сны,—
Только не неведомые страхи
Незнакомой, призрачной войны.

Мама близко. Тишина в квартире.
Отдыхают книжки на столе.
Чтоб спокойно спали дети в мире,
Нужно мир упрочить на земле.

НАСУСТРАЧ ФЕСТЫВАЛЮ

У НАШЫХ МУЗЫКАНТАЎ

Чатыры разы у тыдзень збіраецца для рэпетыцый духавы аркестр. Ён раздзелены на дзве групы, у адной з якіх займаюцца удзельнікі асноунага саставу, а у другой—вучні.

Кіраунік аркестра І. Е. Відорчык расказаў, што працуюць яны у асноуным над танцавальным рэпертуарам. Развучана многа новых маршаў мелодый бальных танцаў.

Цяжка абыйсціся без духавога аркестра на дэманстрацыі, студэнцкім вечары. Гэта калектыу, ад якога патрабуецца найбольшая адказнасць.

Аркестр нядрэнна забяспечан інструментамі, але для шматлікага саставу нехапае валторн, флейт, кларнетаў.

Найбольш актыуна удзельнічаюць у занятках аркестра такія студэнты, як Бакаў, Валадковіч (III курс аддзялення фізікі), Андрэеў (II курс геолага-геаграфічнага факультэта), Лепяшкоў (III курс юрфака).

Але ёсць і такія удзельнікі, якія прапускаюць рэпетыцыі. Рэдкімі гасцямі на занятках бываюць Трус (III курс гістарычнага факультэта), Герус (IV курс аддзялення журналістыкі), Маеускі (фізіка-матэматычны факультэт), Ганчароу (філфак).

Поспех у рабоце аркестра залежыць перш за усё ад наведвання заняткаў і засваення матэрыялу.

Зараз аркестр занят падрыхтоукай да фестывалю. Намечана развучыць марш «Баявы паход», некалькі новых танцавальных мелодый.

НА ЗДЫМКУ: А. Лепяшкоу на рэпетыцыі.
Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

ПЕДАГОГ

(Нарыс)

(Працяг, пачатак на 3 стар.)

Адноічы, калі маладая настаунніца задала яму нейкае пытанне, ён далікатна усміхнуўся і з захапленнем сказаў:

— Якая ты прыгожая! Чорнавокая, з косамі... Пябе, мабыць, хлопцы кахаюць.

Страшэнны выбух рогату абарваў яго камплімент. Пачырванеушая, са слязьмі на вачах прыбегла настаўніца ў канцылярыю.

Пасля ўрокаў Карабанаў стаяў перад дырэктарам школы—Захарам Ошэравічам і, перамінаючыся з нагі на нагу, нахабна бубніў:

— Падумаеш, абраза! Што? Прасіць прабачэння? Гэтага яшчэ не хапала!

Доўга гутарыў дырэктар у той вечар, і на вялікае здзіуленне усёй часцей і часцей лавіў сяое на тым, што гэты нахаонік яму усё больш падабаецца. Нейкае унутранае педагагічнае чуццё падказала яму, што Карабанаў усёж-такі добры, разумны хлопец. Крадзяжы, нахабства і бойкі не галоунае у ім. Скарэй за усё гэта знешні налёт жыццёвага бруду. У гады вайны, страціушы сваіх бацькоу, хлапчук трапіу у партызанскі атрад, але у час страшэннай галоднай блакады, калі гітлераўцы акружылі злучэнне, прыціснуушы партызан да Прыпяці, ён неяк адбіуся ад атраду і з таго часу, калі карыстацца яго тэрміналогіяй, жыу «на колах», а прасцей кажучы, блукаў і займаўся крадзяжоў на чыгуначных станцыях.

«Мой педагагічны абавязак—перавыхаваць іх»,—часта думаў настаунік, і усё больш схіляўся да таго, каб перайсці на работу у дзіцячы дом.

За добра наладжаную работу у школе Захару Ошэравічу быу уручаны значок «Выдатнік народнай асветы». Гэта канчаткова пераканала настаўніка аб пераходзе. І малады педагог стаў дырэктарам дзіцячага дома.

Спачатку было вельмі цяжка. Але у хуткім часе набылі адзенне, абутак. Усе выхаванцы пачалі хадзіць у школу. Здавалася, што жыццё дзяцей пачынае уваходзіць у нармальную каляіну і педагагічнаму калектыву можна пажынаць першыя плады сваёй упартай працы. Аднак нечакана старое усплывала зноў. У адзін з зімовых дзён, парэзаушы брытвай мясцовага школьніка, збег Антон. А праз некаторы час, абакраушы дзіцячы дом, уцёк і Уладзімір Карабанаў. Гэта было самым балючым ударам для Захара Ошэравіча. У тыя горкія мінуты педагогу здавалася, што грош цана усёй яго працы, што усё патрэбна пачынаць спачатку. І зноў па начах у кабінеце гарэла лямпа. Дырэктар уважліва вывучаў сачыненні Макарэнкі, Крупскай, Ушынскага. Паулава, адшукваючы адказы на пытанні, якія так востра паставіла жыццё.

На здымку: З. Зімак з былымі выхаванцамі калоніі, цяпер студэнтамі БДУ.

(Працяг будзе). **Н. САКАЛОЎ.**

Па слядах пісьма у рэдакцыю

Аб адным комсамольскім сходзе

Новае комсамольскае бюро трэцяга курса аддзялення журналістыкі (сакратар Т. Арлова) рашыла ажывіць работу у групе, зацікавіць комсамольцаў. Але не так проста знайсці нешта новае, захапіць іх. Разам з добрым, вартым падтрымкі і пераймання, у калектыве рабіліся промахі.

Вось аб гэтых памылках і недахопах і напісаў у рэдакцыю шматпражкі староста першай групы В. Драгуноў. Ён справядліва адзначаў, што у апошні час, захапіушыся стаушай моднай ідэяй вольнага наведвання лекцый, студэнты сталі адносіцца да вучэбнай дысцыпліны, як да нечага аджыушага і непатрэбнага. Рэдкія госці у аудыторыі Даніленкава, Станюта, Клебанаў. Пачынаюць успліваць нават заклікі да байкоту асобных прадметаў і выкладчыкаў. Бюро-ж яшчэ недастаткова змагаецца з такімі настроямі, пускае справу на самацёк. Пачаушы выходзіць курсавы сатырычны часопіс «Бурбалкі» не заняу прынцыповай пазіцыі, імкнецца абыйсці «вострыя вуглы», дапускаючы пры гэтым перагібы у адносінах да асобных таварышаў.

Але былі у пісьме Драгунова і непрадуманыя вывады.

Комсамольцы III курса аддзялення журналістыкі сабраліся, каб абмеркаваць закранутыя Драгуновым пытанні, пагаварыць аб набалеушым на сходзе, дзе прысутнічалі дэкан факультэта М. Г. Ларчанка сакратар партбюро Д. Е. Фактаровіч, выкладчыкі М. С. Зярніцкі, Н. А. Сніцарава і др.

Спрэчкі былі бурнымі, але усе згаджаліся, што прыведзены Арловай спіс прагульшчыкаў прымушае задумацца, што далей так працягвацца не можа і мірыцца з такім узроунем дысцыпліны нельга. Аднак часта яшчэ у нас за лічбамі прапушчаных лекцый не заўважаюць чалавека.

Многа робіцца на курсе станоўчага у развіцці самых сяброускіх адносін са студэнтамі тэатральнага інстытута. Праведзены цікавы дыспут па кінафільму «Вясна на Зарэчнай вуліцы».

Шмат увагі было удзелена і «Бурбалкам». Гэты часопіс пакуль што не стаў зброяй комсамольцаў у барацьбе за дысцыпліну на курсе, за выхаванне студэнтаў. Першы нумар яго у асноўным быу выскаляльным. У адносінах-жа да Драгунова рэдкалегія (рэдактар Нікалай Гілевіч) дапусціла яунуюнетактычнасць і перагіб. І комсамольцы, і прысутнічаючыя выкладчыкі раілі зрабіць часопіс больш прынцыповым і баявым, улічыць першыя памылкі.

Многа непрыемных слоў на гэтым сходзе давялося пачуць Драгунову. У пісьме ён узняу даволі правільныя, своечасовыя пытанні, але узняу іх толькі тады, калі яго пакрытыкавалі у часопісе. Яго пагарда да крытыкі дайшла да таго, што ён выкрэслу у «Бурбалках» эпіграму у яго адрас і напісаў у адказ сваю.

Сход паказаў, як адзначыу М. Г. Ларчанка, што на трэцім курсе аддзялення журналістыкі здаровы, моцны калектыу, але ёсць у ім яшчэ і свае «хваробы», свае недахопы, якіх ён можа і павінен пазбавіцца.

Комсамольская работа толькі тады будзе карыснай, патрэбнай і цікавай, калі яна будзе дапамагаць умацаванню дысцыпліны, калі будзе захапляючай і нешаблонай.

Г. БУРАЎКІН.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19 Рэдактар А. ВОЛК.

АТ 10513 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 34 Тыраж 2000